УДК 821.161.3

*У.А. Сенькавец, В.В. Хвораст*

# ВОБРАЗНАЯ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ ЦВЁРДЫХ ЖАНРАЎ І ЖАНРАВЫХ ФОРМ У БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ 50–70 гг. XX ст.

У артыкуле разглядаецца вобразнае багацце цвёрдых паэтычных жанраў і жанравых форм ў беларускай літаратуры 50–70 гг. XX ст.

Адным з вельмі важкіх паказчыкаў нацыянальнай паэзіі з'яўляецца наяўнасць ў ёй цвёрдых жанраў і жанравых форм. Адметнасць цвёрдых форм верша вызначаецца не столькі акрэсленасцю праблемна-тэматычнай прасторы, колькі кананічнай стабільнасцю фармальных складнікаў твора: пастаянствам вершаванага памера, рыфмоўкай, колькасцю радкоў і інш., што характэрна, напрыклад, для санета, трыялета, секстыны, актавы, рандо і г.д.

Вобразная разнастайнасць высокаякаснай паэзіі, як і літаратуры ўвогуле, невычэрпная, яна не можа быць абмежаваная творчым мысленнем, індывідуальным светаадчуваннем, талентам таго ці іншага мастака слова. На ніве літаратуры плённа працуюць шмат паэтаў, і кожны па-свойму ўзбагачае паэзію, прыўносіць у яе нешта асабістае, адметнае, непаўторнае. Але вельмі часта творчасць розных паэтаў аб'ядноўваюць пэўныя тэмы, узнікненне і актуальнасць якіх шмат ў чым абумоўлена асаблівасцямі грамадска-палітычнага, сацыяльнага, культурнага жыцця краіны. Так, у 50-ыя гг. XX ст. асабліва актуалізуецца ваенная тэма, паэзія імкнецца да асэнсавання складаных праблем рэчаіснасці, паступова набывае рысы грамадзянскасці. У другой палове дзесяцігоддзя выяўляецца тэндэнцыя да аднаўлення дамінанты агульначалавечых каштоўнасцяў у літаратуры. Што да цвёрдых жанраў і жанравых форм, дык у гэты час беларуская літаратура на іх амаль не адгукнулася. Цвёрдыя формы вершаў былі малапрадуктыўныя, беларускія творцы рэдка звярталіся да іх у сваёй творчасці. Відаць, надзвычай складаны пасляваенны час не пакінуў мастакам слова часу для рознага кшталту творчых эксперыментаў. Праяўленне не надта вялікай цікавасці да цвёрдых жанравых форм можа быць звязана і з тым, што частка іх на той час усё яшчэ заставалася з'явай новай, слаба адаптаванай у беларускай паэзіі.

Такім чынам, паэзія 50-ых гг. XX ст. (у прынцыпе, як і паэзія ранейшага часу) прапаноўвае для аналізу не асабліва вялікую колькасць цвёрдых форм верша. Звернем увагу на вядомую тэрцыну М. Танка «Ля гэтых сосен» (1952 г.), якая ўвайшла ў выдадзеную ў 1954 г. кнігу «У дарозе». У вершы перад намі паўстае яскравы вобраз велічных, магутных нарачанскіх сосен, што сваёй незвычайнай прыроднай моцай і ў той жа час «бацькоўскай» пяшчотай прывабліваюць лірычнага героя. Ён не ўтойвае сваёй любові да гэтых дрэў, больш за тое, тлумачыць, чаму ж так «дарагі яны заўсёды» яго сэрцу. Лірычны герой прызнаецца, што

Ля гэтых сосен цяглых, векавых
Не ўспомніць нельга грозных дзён мінулых
І партызанскіх вогнішчаў і тых,
Чые курганы слава ахінула.
Яшчэ і сёння з кожнага ствала
Смала слязіцца, дзе ўпілася куля [8, с. 69].

Жыццё лірычнага героя сапраўды вельмі моцна паяднанае з гэтымі гуллівымі соснамі, бо каля іх і

Маладосць прайшла,
І я ў дні вераснёвыя свабоду
Сустрэў тут, ля рыбацкага сяла [8, с. 69].

Паэт мае на ўвазе той неверагодна шчаслівы, доўгачаканы момант, калі ў верасні 1939 г. даведаўся ад хлопцаў з суседняй вёскі, што Чырвоная Армія перайшла мяжу, каб вызваліць Заходнюю Беларусь. Як бачым, у тэрцыне М. Танк не проста выдатна намаляваў вобраз нарачанскіх сосен, паэт здолеў выявіць адносіны лірычнага героя да згаданага вобраза. І дзякуючы гэтаму дапоўніў яго іншымі, дадатковымі, але не менш значнымі вобразамі, якія паглыбляюць сэнс верша. Такім чынам, мастацкая абмалёўка цэнтральнага вобраза пры дапамозе перыферыйных дае мажлівасць чытачу ўявіць значна шырэйшую і ў часавых, і ў прасторавых адносінах карціну.

У 50-я гг. ХХ ст. больш актыўна спрабуюць выкарыстоўваць у сваёй творчасці цвёрдыя жанры і жанравыя формы беларускія паэты-эмігранты. Так, напрыклад, М. Кавылём у гэты час былі напісаныя некалькі тэрцын, трыялетаў, санетаў, рандо. У санеце «Крытыку» (1955 г.) М. Кавыль стварае абагулены вобраз верша, які валодае надта вялікай сілай, што можа пэўны час заставацца схаванай, нядзейснай, але толькі да той пары, пакуль «у сэрцы зара не зазвоніць». М. Кавыль называе верш малітвай паэта, якая вырываецца з душы творцы падчас «несуцешных» жыццёвых абставін і дапамагае «бальзаму напіцца». І тут паэт стварае яшчэ адзін важны вобраз – вобраз сярдзітага крытыка, які не здольны ні ацаніць вартасць верша, ні атрымаць ад яго асалоду, ні ўзбагаціць свае ўласныя душэўныя сілы, але які толькі і робіць, каб «блудасловіць бязбожна».

У вершы «Рандо» М. Кавыль паказвае цэлую карціну далёка не бясхмарнага, а поўнага выпрабаванняў жыцця лірычнага героя, які, нягледзячы на свой складаны лёс, старанна беражэ ў душы тое, што мацуе, што дае сілы ісці далей, – веру. Лірычны герой разумее, што «не ў нас ключы ад брамаў княжых», але моцна верыць: «ускросне Збаўца, павядзе, выведзе на чын». Акцэнтаваць увагу на ключавым у вершы дзеяслове «веру» дапамагае форма рандо: гэтым словам пачынаецца верш, яно паўтараецца ў сярэдзіне твора і заканчвае яго.

Зразумела, што беларуская паэзія 50-ых г. ХХ ст. мае і іншыя прыклады вершаў цвёрдых жанраў. Але ўсё ж іх недастаткова, каб гаварыць пра пэўную вобразную сістэму як катэгорыю заканамерную. Болей распаўсюджанымі становяцца цвёрдыя формы верша ў 1960-я гг. Класічныя віды строф з'яўляюцца ў творчасці У. Караткевіча, Д. Бічэль-Загнетавай, Р. Барадуліна, К. Кірэенкі, А. Звонака, Н. Гілевіча і інш.

Сярод усіх цвёрдых паэтычных жанраў самым папулярным, а таму і багатым на разнастайныя вобразы, стаў у 1960-я гг. у беларускай паэзіі санет. Распрацоўкай гэтага жанра актыўна займаўся А. Звонак. У яго вершах пачатку дзесяцігоддзя вельмі выразныя матывы ўслаўлення камунізма, працы, светлай будучыні. Менавіта таму ў адным з санетаў А. Звонака («Плошча», 1960 г.) з'яўляецца вобраз Крамлёўскай плошчы, названай плошчай міру, сэрцам свету, бо менаваіта адсюль

Праклаў Ільіч у час крылаты
Да камунізма першую вярсту [4, с. 176].

Тым самым А. Звонак ухваляе асобу У.І. Леніна, які

Адкрыў шляхі ў такую далячынь,
Дзе людзям вечна свеціць шчасця сонца [4, с. 176].

У санеце «Слова» (1960 г.) паэт стварае вобраз звычайнага рабочага чалавека, які ўзышоў на трыбуну з прамовай і здолеў

Без шырокіх жэстаў, ад душы,
З аганьком трывалага запалу

растлумачыць слухачам сэнс вялікай «мудрасці веку», вобраз якой заўважаецца ў многіх санетах А. Звонака пачатку 1960-ых гг. [4, с. 178].

Увогуле, вобразы, створаныя А. Звонакам у яго шматлікіх санетах, вельмі разнастайныя: гэта і вобраз ветэрана, якога можна пазнаць «па мужных рысах твару, // Па рэдкіх слоў вазе і позірку цяжкім» [4, с. 186], і вобраз непаўторна дзіўнага горада Вільнюса, «дзе ўсё – кантраст, дзе даўнасць з навізной // Існуюць побач» [4, с. 188], і вобраз памяці, якая здольная будзіць «далёкі свет юнацтва» [4, с. 190]. Пра сваё замілаванне родным краем піша А. Звонак у санетах «Мелодыя» (1968 г.), «Спакой» (1969 г.) і іншых. Паэт стварае вобраз Радзімы, перадае непаўторнае гучанне яе голасу – чароўнай мелодыі жыцця – праз «шэпт былінак, грукат навальніцы, // Праз пошум ветра, шолахі трысця» [4, с. 198]. Зачараваны роднымі мясцінамі, А. Звонак упэўнены, што толькі тут, у айчынным доме, каля ракі Свіслач можа знайсці самы сапраўдны спакой, адчуць шчасце душэўнай гармоніі, бо

Тут жыў. Тут рос. Тут круг замкнецца мой.
Пакінуў тут я сэрца свайго частку,
Каб даў спакой мне вечны неспакой! [4, с. 200].

У санеце «Мэта» (1965 г.) А. Звонак разважае пра тое, што павінен рабіць ён як «каваль свінцу апаленых слоў» і прыходзіць да высновы, што, каб «дайсці да найвышэйшай мэты, // З якой усё жыццё навек звязаў», трэба «вершам вольным ці радком санета» «даспяваць усё, што недапета, // І ўсё, што недасказана, – сказаць» [4, с. 191].

Працаваў у жанры санета ў 1960-я гг. і Ніл Гілевіч. Так, шырока вядомы яго санет «Асвенцім» (1964 –1965 гг.) уяўляе сабой жахлівы праклён «усім падпальшчыкам вайны», які гучыць тысячамі нявінных галасоў ахвяр Асвенціма:

Нас з’еў агонь – чатыры міліёны
Мужчын, жанчын, дарослых і дзяцей.
Скажыце: дымам з вогнішча касцей
Сягоння свет ужо не заімглёны?
Скажыце – мёртвыя, мы хочам знаць:
З жаночых кос як таннай сыравіны
Ужо не ткуць сягоння мешкавіны
І дываноў, каб ногі выціраць?
А каб мільёнамі не паміраць –
Вы знаеце, што вы рабіць павінны? [1, с. 42].

Паказальна, што беларускія паэты вызначыліся ў архітэктанічнай арганізацыі буйных санетных структур. Напрыклад, у 1960-х гг. быў створаны тэтрапціх Р. Барадуліна пад назвай «Год» (1966 г.). Гэты твор уяўляе сабой цыкл з чатырох санетаў, кожны з якіх апавядае пра пэўную пару года: вясну, лета, восень ці зіму. Пейзажныя вобразы атрымаліся вельмі яскравымі, метафарычнымі. Скажам, надыход лета паэт апісвае так:

З далёкага цяплыньскага павета,
Пакінуўшы ржавець з’араны плуг,
Спатнелае расхрыстанае лета
Прыйшло – і луг ад конікаў аглух.
Смугою ахінулася планета.
Займае дых гарачы кменны дух.
Дзе воблачка, дзе дзьмухаўцовы пух?
І просінь просіць шырыні ў прасвета.

Своеасаблівы цыкл з пяці санетаў атрымаўся ў К. Кірыенкі. У «Санетах з Філадэльфіі» (1969 г.) паэт стварае вобразы амерыканскай рэчаіснасці: тут і музей мастацтваў з палотнамі Рэмбранта і Далі, і амерыканка, якая частуе, песціць дэльфінаў, а пасля – стрэл...

І каля ног амерыканкі – кроў дэльфіна…
Стракоча кінакамера. Схіліўшы галаў,

Стаіць амерыканка. І маўчыць.
Каля яе паскудны смех гучыць.
Яна ж – маўчыць. Яна свой атрымала долар.

К. Кірыенка паказвае грубую карціну падаўлення дэманстрацыі ў горадзе, «мардабой», гвалт, свіст, кроў… Апынуўшыся ў такой «непяшчотнай яве», паэт расчараваны ўбачаным, бо ён хацеў знайсці Амерыку «ў красе і волі», а ўбачыў у «гарачцы і калатні» [5, с. 69].

Адной з найбольш складаных і рэдкіх архітэктанічных структур з'яўляецца вянок санетаў. Першыя вянкі санетаў у беларускай паэзіі былі створаныя ў 50-х гг. ХХ ст. А. Салаўём (1952 г.) і М. Кавылём (1965 г.). Але і ў 1960-х гг. традыцыя гэтай складанай вершаванай формы працягнулася, у прыватнасці, у творчасці Н. Гілевіча, які ў 1964–1965 гг. стварыў вянок санетаў «Нарач», прысвечаны М. Танку. У сваім творы Ніл Гілевіч стварае вобраз песняра Нарачы, услаўляе яго асобу і Нарачанскі край.

Паэзія 60-х гг. ХХ ст. дала прыклады не толькі такога цвёрдага жанру як санет, але яшчэ і тэрцын, і трыялета. Так, вядомыя тэрцыны У. Караткевіча «Апошняя песня Дантэ» (1962 г.). У іх знайшло яркае ўвасабленне мінулае, вобраз дзеяча сусветнай мастацкай культуры Дантэ Аліг'еры – італьянскага паэта Сярэднявечча.

Сярод трыялетаў можна адзначыць верш Д. Бічэль-Загнетавай «Не называй мяне жаданай…» (зборнік «Нёман ідзе», 1964 г.). З самага пачатку трыялета відаць, што гэта верш інтымнай тэматыкі. Перад намі вобраз маладой жанчыны, якая, відаць, ужо моцна стамілася ад пакут кахання ці згубіла давер да свайго любага, а таму адмаўляецца ад шчасця з ім:

Не называй мяне жаданай.
Хай лепей воблачкам я стану.
Сама ад шчасця палячу.
Не называй мяне жаданай.
Я не магу пра гэта чуць....

Такім чынам, вобразы, створаныя ў паэзіі цвёрдых жанраў і жанравых форм у 60-х гг. ХХ ст. даволі разнастайныя: ад вобразаў са сферы грамадска-палітычнага, сацыяльнага жыцця да вобразаў з філасофскім, а таксама глыбока інтымным напаўненнем. Пашырэнне кола разнастайнасці вобразаў у паэзіі цвёрдых жанраў, якая стваралася на працягу 1960-х гг., звязана з тым, што цікавасць да класічных відаў строф паступова расце і ўсё большая колькасць паэтаў звяртаецца да іх у сваёй творчасці. У пацверджанне таму – 70-я гг. ХХ ст., калі настойлівыя беларускія паэты працягваюць даволі інтэнсіўна асвойваць класічныя паэтычныя жанры і жанравыя формы. Сярод такіх паэтаў-«шукальнікаў» можна адзначыць Р. Крушыну, Я. Сіпакова, А. Звонака, А. Грачанікава, М. Танка, Н. Гілевіча і інш.

Так, у паэзіі цвёрдых жанраў Р. Крушыны даволі часта з'яўляюцца вобразы, якія спрыяюць больш дасканаламу выяўленню іншага вобраза – роднага краю, светлага і адзіна жаданага. Напрыклад, у адным з трыялетаў Р. Крушыны вобраз півоняў, якія «цвілі ў гародчыку" і якімі «захаплялася радня» [6, с. 108], выступае як сімвал роднай старонкі. Згадка пра гэтыя цудоўныя кветкі аказалася для лірычнага героя мастком паміж надзённай эмігранцкай рэальнасцю і непераадольным жаданнем апынуцца ў родных мясцінах. У іншым жа выпадку трывалая сувязь лірычнага героя з радзімай выяўляецца праз вобраз-сімвал рамонкавага настою. Лірычны герой тэрцынаў «Я п'ю рамонкавы настой…» не хоча верыць у тое, што ён знаходзіцца «ў марнасці пустой» і што сны яго (відаць, пра шчаслівае жыццё ў «каханым» краі) – усяго толькі «попел згаслых галавешак» [6, с. 116]. Лірычны герой не ўтойвае, што часта згадвае радзіму і вельмі чакае ласкавай сустрэчы з ёю. Таму і п'е рамонкавы настой, адчуваючы ў ім сілу і шчырую надзею, нават нейкую перакананасць у ажыццяўленні жаданага.

Цікавым у плане раскрыцця вобраза радзімы з'яўляецца секстына Р. Крушыны «Спяваюць думкі часта апаўночы…». У гэтым вершы вобраз роднага краю замілавана падаецца праз вобраз лёгкага жаночага стану. Лірычнага героя хвалююць «кужаль валасоў, незабудкі-вочы» яго любай, ад згадак пра якую міжволі пачынаюць спяваць думкі, праразаючыся ва ўсхваляваную песню душы. Песня гэтая настойліва і ў той жа час нязмушана гучыць праз усю секстыну. Не маючы мажлівасці пабачыць на свае вочы той «лёгкі стан жаночы», лірычны герой просіць зорак з вышыні зірнуць на яго мілую. Ад безвыходнасці ціхі смутак і туга палоняць лірычнага героя, які ўсё ж спадзяецца, што не дарма пяе гэтую «любоў». І ўсё ж па-ранейшаму «дзесьці твой далёкі стогн жаночы // Я чую ўранні, ўдзень і апаўночы» [6, с. 111], – спавядаецца лірычны герой.

Любоў да роднага краю апяваецца і ў трыялеце Я. Сіпакова «Тры прыгаршчы вады ў крыніцы…» [7, с. 145], у якім выяўлена глыбокая павага лірычнага героя да зусім плыткай крынічкі, якая здольная хваляваць сэрца і да якой хочацца спяшацца на паклон. У чым жа прыцягальная моц гэтага, здавалася б, зусім непрыкметнага стварэння прыроды? А моц у каранях, у вытоках. Відаць, гэтая крыніца – сведка часу і пакаленняў, якая заўжды шчыра дзялілася сваёю сілаю, зараджала энергіяй і беражліва захоўвала памяць аб мінулым. Кожнаму сапраўднаму чалавеку для паўнавартаснага жыцця неабходна адчуваць надзейную сувязь з роднай зямлёй, толькі ў кожнага сувязь гэтая мае розныя праявы. У прыватнасці, лірычны герой трыялета Я. Сіпакова наладзіў сувязь з радзімай праз плыткую крынічку, вобраз якой у гэтым плане падаецца вельмі шчырым.

У іншым ракурсе паўстае вобраз радзімы са шматлікіх санетаў А. Звонака. Так, паэт дужа захапляецца тымі зменамі, што адбыліся ў яго краіне пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, якую ён так урачыста апявае ў своеасаблівых цыклах санетаў «Святлісты дзень красавіка», «Сумленне веку» і інш. А. Звонак шчаслівы ад таго, што ў яго радзіме «дажджы вось толькі глуха прашумелі // І праступіла ізумрудам рунь…» [3, с. 252], намякаючы такім чынам на пачатак «новага» – лепшага – жыцця, якое прынёс з сабою Кастрычнік. Побач з вобразам абноўленай Беларусі паэт стварае вобраз Расіі з яе неабсяжнымі прасторамі:

> Ледзь толькі згасне вечар за Нявою,
> А ўжо ў Амуры плешчацца зара [3, с. 253].

Паэт дзякуе магутнай суседняй дзяржаве за тое, што дапамагла адрадзіць яго родны край і пабратала столькі народаў, нікога не абдзяліўшы «багаццем працы, розуму і духу» [3, с. 253].

Паэзія цвёрдых жанраў і жанравых форм 70-х гг. XX ст. цікавая і многімі іншымі вобразамі. Так, у актавах А. Грачанікава «Начная змена» [2, с. 215–217] створаны вобраз-малюнак начнога свету, у якім ціхае суладдзе соннай прыроды паяднана з неспакоем шашы, рэзкім святлом фараў і бесперабойнай працай цэхаў. У актавах А. Грачанікава жыццё смела бурліць і ў начны час, толькі ці павінна быць так у гэтым свеце?

Вобразы-малюнкі прыроды таксама з'яўляюцца ў зборнику А. Грачанікава «Грыбная пара» [2, с. 103–104]. Цудоўны, доўгачаканы час грыбной пары паэт надзяляе асаблівай цёплай святочнасцю і стварае ў ёй адпаведныя вобразы-малюнкі: грыбніка, які «вынюхвае ўгрэтыя мясціны», калі «яшчэ чырванабокі маладзік // Гайдаецца, уцюкнуты ў яліну» [2, с. 103], і заспанага грыбніка-зайздросніка, які ўжо надта позна (а таму дарма) завітаў у лес. Адметным у гэтым вершы з'яўляецца тое, што паэт А. Грачанікаў трапна правёў паралель паміж грыбной парою і ўласнай творчасцю, калі

> Як грыбніца, набухаюць жылы.
> І думкі непатолеюць, нібы
> У сховах нечапаныя грыбы [2, с. 104].

Тым самым паэт нібы падкрэслівае сваю незвычайна моцную цягу да творчасці.

Тэма творчасці назіраецца і ў вершах класічных жанраў Р. Крушыны, М. Танка, Н. Гілевіча. Так, вобраз залатой аркі паэзіі малюе ў сваім «Санеце» Р. Крушына. Праход праз гэтую арку бачыцца лірычнаму герою мажлівасцю «пачуць, як хвалюе Петрарка // І як наша сучаснасць пяе» [6, с. 108]. Але, каб атрымаць заветны дазвол на праход праз «санетную арку», усталяваную яшчэ з часоў Петраркі і Дантэ, трэба скласці свой якасны санет. І ў лірычнага героя гэта атрымліваецца, бо жывіць яго думка пра тое, што «б'е крыніцы святая вада // Незабыўнага нашага краю» [6, с. 108]. Акрамя гэтага, натхняльнай сілай для Р. Крушыны з'яўляюцца яго «і сны, і мары», паэтычны вобраз якіх ствараецца ў вершы «Рандо». Чарамі музы называе іх Р. Крушына, таму што заўсёды прыносяць вельмі прыемны творчы плён, што так важна для паэтавай душы.

Вяртаючыся да традыцый Петраркі, адзначаных Р. Крушынам у яго «Санеце», хацелася б звярнуць увагу і на «Санет» М. Танка. У ім паэт стварыў цікавы метафарычны вобраз карабля санета, на якім лірычны герой «у век рэвалюцыйны, шмармавы» наважыўся адправіцца «на дальнія сузор'яў астравы», пры гэтым ён упэўнены, што яму ўдасца вярнуцца на зямлю і вытрымаць «ветразі і ванты» [9, с. 29]. А тлумачыць сваю ўпэўненасць лірычны герой так:

Мой карабель – санет
Калісьці збудаваў вялікі Дантэ,
А сам Шэкспір на ім адкрыў сусвет [9, с. 29].

Тым самым падкрэсліваецца доўгая трывалая традыцыя жанру санета, які стаў арыгінальнай мастацкай формай пазнання свету.

У М. Танка ёсць таксама крыху гумарыстычны верш пад назвай «Антысанет», у якім паэт разважае пра тое, што ён падорыць сваёй працавітай Музе на схіле сваіх гадоў. Нарэшце, вырашае прыбраць яе ў санет – «у вопратку багіняў старажытных». Але Муза зусім не рада такому падарунку:

Як мне ў ім дзіцянё карміць, не знаю,
Як працаваць і цешыцца з табой,
Калі санет твой грудзі і стан мой
Чатырнаццаццю клямрамі сціскае [9, с. 66].

Такая вось капрызная аказалася муза М. Танка! Але ж у тым і майстэрства паэта: здолець дакладна выказаць свае думкі нават ў абмежаванай формай колькасці радкоў.

Тэму паэта і паэзіі закрануў у сваёй творчасці і А. Звонак, які ў санеце «Вечары» запэўнівае, што душу – сястру паэта – «спакой ніколі не атуліць». Паводле А. Звонака, кожны паэт павінен ведаць, што «песня лепшая не спета», а таму імкнуцца да самых вышыняў прыгожага мастацтва слова [3, с. 255].

Надзвычай арыгінальна разважаў пра душу паэта Н. Гілевіч у адной са сваіх актаў. Менавіта душа – цэнтральны вобраз яго адметнага верша, у якім Н. Гілевіч, параўноўваючы паэта і фізіка-атамніка, усё ж знаходзіць паміж імі падабенства:

Душа паэта – то ж рэактар вечны,
Што выпраменьвае часціцы болю
І сотні тысяч сэрцаў чалавечых
Бамбардзіруе імі без адбою,
Каб шляхам ядзернага расшчаплення
Прывесці ў рух энергію сумлення [1, с. 82].

Вобраз душы (ужо не толькі паэтавай, а любога чалавека ўвогуле) створаны ў адным з трыялетаў Я. Сіпакова. «Дзе нам баліць, там і душа: // З душы ўвесь чалавек сабраны» – вучыць нас паэт. І абсалютна праваммерна робіць выснову, што «чым большая душа, – // Даўжэй шчымяць і ныюць раны…» [7, с. 134].

Як працяг філасофскага разважання пра чалавечае жыццё – санет А. Звонака «Падрахунак», у якім паэт сцвярджае думку пра тое, што нельга падводзіць у сваім

жыцці канчатковую рысу, «пакуль душа не ператлела ў прысак // І не астыў пад ім пачуццяў жар» [3, с. 261].

Пытанні маральнасці, чалавечнасці закранутыя ў шматлікіх вершах А. Звонака, А. Грачанікава, Н. Гілевіча і інш. Так, матэрыялізаваны вобраз маны, уяўленай у абліччы агіднай змяі, створаны А. Звонакам у санеце «Мана». Мана, схаваная пад «маскаю пампезнай», здольная «душу праесць наскрозь, як моль і тля», зняславіць, «даць словаблудству без замінак ход». Таму паэт настойліва заклікае:

Ганіце прэч маны атрутнай згубу,
Страляйце, як сцярвятніка, у лёт! [3, с. 259].

Пра занядбанне чалавечнасці і дабрыні ў адносінах да блізкіх людзей клапоціцца Н. Гілевіч у актаве «Куды ні глянь – над дахам строй антэн…». Паэт вельмі перажывае, што ў час прагрэсу, калі чалавеку раптам «зрабіўся блізкім цэлы свет», мы міжволі аддаляемся ад тых людзей, што побач з намі, забываемся на падзеі іх жыцця, перажыванні, эмоцыі [1, с. 82]. А ў актаве «Святочны, старажытны дух калядны…» Н. Гілевіч стварыў сапраўдны насычаны вобраз каляднага духу, што некалі напаўняў нашы беларускія хаты на Каляды. Шкада толькі, што цяпер, у час перадавых тэхналогій, дух гэты некуды выветрыўся «і з нашых хат, і з нашых песень-дум» [1, с. 78].

Як бачым, вобразы, што напоўнілі вершы цвёрдых жанраў і жанравых форм у 70-я гг. XX ст., сапраўды даволі разнастайныя: тут і звычайныя паэтычныя вобразы, і вобразы-малюнкі прыроды, вобразы-перажыванні, вобразы-сімвалы. Адметна тое, што ўсе яны, як, напрыклад, класічны для беларускай літаратуры вобраз роднага краю, прадстаўленыя ў розных варыяцыях. Вобразная разнастайнасць паэзіі цвёрдых жанраў і жанравых форм 50–70-х гг. XX ст. далёка не абмяжоўваецца вобразамі згаданых вышэй вершаў. Гэта сведчыць пра тое, што кола паэтычных вобразаў, створаных у акрэслены перыяд, вельмі шырокае, а таму патрабуе больш грунтоўнага аналізу.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Гілевіч, Н. Выбраныя творы / Н. Гілевіч // Уклад., камент. Н. Гілевіча; прадм. У. Конана // Мінск : Кнігазбор, 2009. – 600 с.
2. Грачанікаў, А. Калі далёка ты…: Выбр. лірыка // А. Грачанікаў // Мінск : Маст. літ., 1979. – 368 с.
3. Звонак, А. Выбраныя творы : ў 2 т. / А. Звонак // Мінск : Маст. літ., 1977. – Т. II. – 320 с.
4. Звонак, А. Сябрына : Выбр. творы: Вершы. Паэмы, 1925–1985 / А. Звонак. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 383 с.
5. Кірэенка, К. Збор твораў : у 3 т. / К. Кірэенка. – Мінск : Маст. літ., 1987. – Т. 2: Вершы, паэмы, 1962–1981. – 495 с.
6. Крушына, Р. Выбраныя творы / Р. Крушына. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2005. – 448 с.
7. Сіпакоў, Я. Выбраныя творы : у 2 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск : Маст. літ., 1995. – Т. 1: Паэзія. – 431 с.
8. Танк, М. Выбранае : Вершы / М. Танк. – Мінск : Маст. літ, 1993. – 335 с.
9. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 5: Вершы (1972–1982). – 448 с.

***Senkavets U.A., Khvorost V.V.*** **Image Variety of Kanon Genres and Genre Forms in Belorusian Poerty of the 50–70-s of the 20th Century**

The article deals with the image richness of kanon poetic genres and genre forms in Belorusian literature of the 50–70-s of the 20th century.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 24.07.2014